Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 24/04/2024 22:35:29

DOI:10.17951/sb.2023.17.343-344
Studia Białorutenistyczne 17/2023 REVIEWS
ISSN: 1898-0457 e-ISSN: 2449-8270 Licence: CC BY 4.0

Dzmitry Rubin

Independent researcher (Belarus)
e-mail: varknimbius2805@gmail.com
https://orcid.org/0009-0005-8346-0874

## Быць вольным...

**”Нетутэйшыя: reversion: беларуская эксперыментальная драматургія («ТВЛ», «Бум-Бам-Літ»)”. Аўтары-складальнікі: Алена Лепішава, Виктар Жыбуль, Змицер Вішнёў. Zürich: Diaphanes, 2023, 580 с. (Серыя „Мысліць мастацтва” Інстытута тэорыі Цюрыхскай вышэйшай школы мастацтваў і Цэнтра мастацтваў і тэорыі культуры Цюрыхскага ўнiверсітэта)**

*To Be Free...*
*"Otherworldly: reversion: Belarusian experimental drama ("TVL", "Boom-Bam-Lit")". The authors are: Elena Lepishava, Viktar Zhibul, Dmitry Vishnev. Zürich: Diaphanes, 2023, p. 580 (The series "Thinking Art " by the Institute of Art History of the Zurich University of the Arts and the Center for Arts and Cultural Theory of the University of Zurich)*

Важкая і вялікая кніга. Калі б была ў цвёрдай вокладцы, то была б яшчэ больш важкая. А калі б шрыфт большы і палі, то была б яшчэ больш вялікая. Але, што маем, тое і маем.

Кніга складаецца з трох асноўных частак: прадмова-даследванне ад Алены Лепішавай, збор творыкаў „нетутэйшых” (у тым ліку і маніфесты), хроніка сцэнічных крокаў (летапіс перформансаў узятага перыяду). У сукупнасці гэтыя тры часткі і даюць эфект. Кніга перастае быць даследаваннем ці анталогіяй, яна робіцца ўсім і для ўсіх. Яна набывае трохмернасць, якой вельмі часта не стае пры размовах на такія тэмы.

У першай частцы нам расказваюць пра агульны расклад. Пра месца беларускай драматургіі ў сусветнай. Самі ведаеце гэта месца. Самі ведаеце, на прыкладзе літаратуры, што ў нас перш „беларуская”, а пасля толькі, што там атрымаецца. Часам наша беларускасць не горш за савецкасць. Але мастацтва – гэта бунт, правакацыя, супраціў. У дадзеным выпадку праблема ў тым, што супраціўляючыся таму што ёсць, ты застаешся ў той жа па-за сусветнай плоскасці,

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 24/04/2024 22:35:29



таму трэба рабіць штосьці іншае, выбягаць за межы дыхатаміі, нараджацца нанова адначасова працягваючы жыццё. Як?

Першая ўмоўная частка мне вельмі прыглянулася, і яна важная, яна патрэбная, яна значная, але тут яна толькі адно з трох вымярэнняў. Постфакт тэорыя. Логіка пройдзеных выпадковасцей. Учарашні кантэкст.

Другая частка. Творыкі. Самыя розныя па якасці. І гэта важна. Вельмі важна. Бо ў большасці тыя аўтары-пачынальнікі сёння слупы і іншыя словы. Важна ведаць, што і ў іх было недарэчнае і яны не супыняліся. Важна бачыць як намацоўваўся той шлях, у той час, які і сёння не асабліва пратаптаны і відочны. Бачыць, як наіўныя і амбітныя, свавольныя і нявопытныя білі сваімі словамі, спробамі, галовамі ў сцены, што ніхто нават і не думаў прыбіраць перад імі. Калейдаскоп настолькі ўдалы, што пры чытанні можна прайсці праз увесь спектр эмоцый.

Трэцяя частка. Мы сустракаем жывых людзей. І гэта яшчэ адзін слой, які стварае канчатковы патрэбны аб'ём. Рэдкі слой для нашага беларускага звышкультавага асяроддзя, дзе ёсць кантэкст: месца і час; ёсць творы. Але няма жывых людзей. Тут жывыя людзі ёсць. І яны самі расказваюць пра сябе рознымі галасамі. Кожнае слова кропля крыві ў хранічную абяскроўленасць. Мяне, напрыклад, вельмі зачапілі развагі Віктара Жыбуля тых далёкіх часоў. Зараз Віктар вылучаецца чытаннем сваіх вершаў. Вершы запоўнены нечым чароўна вар'яцкім і аўтар-выканаўца перадае гэта ўсё праз чытанне. А раней не ўмеў. А раней разважаў, як жа так прыдумаць, каб не манатонна, каб сапраўды штосьці перадаваць, штосьці іграць. Не ўяўляецца.

Не ўяўляецца. Настальгія па не бачанаму, не пражытаму. Па той дарозе, што засталася ў чужым мінулым. Але без яе не даведацца, дзе ты стаіш зараз. Як ты прыйшоў сюды і чаму. Не даведацца, наколькі ты не адзін. Наколькі жывое і вольнае было, ёсць і будзе вакол. Што для таго, каб рабіць "беларускае", неабавязкова забіваць на слова, якое ідзе пасля „беларускае". А яшчэ, што трэба жыць. Жыць вольным.